# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 314

## ДА ПЫТАННЯ АБ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАЎНІЦТВА У БЕЛАРУСКАЙ ССР У 1930-Я ГГ.

***М.К. АЛЬХОВІК***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** У беларускай гістарыяграфіі нацыянальная палітыка ў БССР 1930-х гг. адлюстравана фрагментарна. Даследчыкі засяродзілі сваю ўвагу на вывучэнні толькі некаторых праблем нацыянальна-культурнага развіцця карэннага насельніцтва: згортвання беларусізацыі і курсу на задавальненне этнакультурных патрэбаў нацыянальных меншасцяў, вывучэння дзейнасці камісіі Затонскага, пастаноў савецкай улады па нацыянальным пытанні, ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі на пэўных участках дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва [1; 2; 3; 4; 5; 6]. Айчынная гістарыяграфія не абмінула і праблематыкі развіцця этнічных супольнасцяў БССР у 1930-я гг. [7; 8; 9; 10; 11; 12; 13] і у т.л. нацыянальнага фактару палітычных рэпрэсій [14; 15]. Аднак гісторыкам яшчэ належыць стварыць цэласную карціну нацыянальнай палітыкі, якую праводзіла партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва ў 1930-я гг.

**Асноўная частка.** Нацыянальную палітыку акрэсленага перыяду можна ахарактарызаваць наступнымі рысамі:

1) *Вырашэнне нацыянальнага пытання поўнасцю падпарадкоўваецца задачам сацыялістычнага будаўніцтва, ператварыўшыся ў яго другарадны фронт*. XVI з’езд УКП(б) (1930 г.) прадпісаў канчаткова вырашыць нацыянальнае пытанне «ў найбліжэйшы час» з тым, каб яно «было назаўсёды здадзена ў архіў» [16, с.3]. Само паняцце «нацыянальная палітыка» шмат у чым страчвае культурнае вымярэнне. Галоўная ўвага надаецца барацьбе з праціўнікамі кіраўнічага рэжыму і сацыяльна-эканамічным мерапрыемствам. VIII Пленум ЦК КП(б)Б 12 траўня 1940 г. канстатаваў, што «ў выніку ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі Беларусь пераўтварылася з адсталай дробнабуржуазнай краіны, ускраіны царскай Расеі, у перадавую індустрыяльную Савецкую Сацыялістычную рэспубліку» [17, арк.3].

2) Улада прадпрымае захады, накіраваныя на *перамогу класавай ідэнтыфікацыі і салідарнасці над нацыянальнай і ўмацаванне сувязяў народаў СССР*. Носьбіты нацыянальнай ідэі вызначаліся як найвялікшыя злачынцы і гэткімі ж паўставалі ў вачах насельніцтва. Клопаты аб самабытнасці якой-небудзь мовы і культуры расцэньваліся як контррэвалюцыйныя [18, с.2].

3) *Усталёўваецца поўная манаполія Камуністычнай партыі на вызначэнне курсу нацыянальнай палітыкі.* Праціўнікі афіцыйнай лініі ў нацыянальнай палітыцы падлягалі асуджэнню і праследу.

4) *Дзейнасць беларускіх партыйна-дзяржаўных органаў поўнасцю кантралюецца і верыфікуецца ЦК УКП(б).*

У беларускай гістарыяграфіі існуе два пунткы гледжання на тое, калі скончылася беларусізацыя. Большасць даследчыкаў (Р.Платонаў і інш.) сцвярджае, што ў выніку дзейнасці камісіі ЦК УКП(б) на чале з Затонскім у 1929 г. і вынясення прысуду па справе «СВБ» у 1930 г. была згорнута беларусізацыя і пачалася русіфікацыя. Так лічыць нават відавочца падзей М. Улашчык [19, с.384]. Між іншым, шэраг даследчыкаў звярнулі ўвагу на тое, што ў пачатку 1930-х гг. шмат у чым яшчэ захоўваўся ранейшы курс у нацыянальнай палітыцы [20, 21, с.2].

На нашу думку, меркаванні першых і другіх не супярэчаць адно аднаму. Па-першае, камісія Затонскага пацвердзіла курс на беларусізацыю, бо яна дапамагала шырокім масам у культурным развіцці і садзейнічала саветызацыі, але вызначыла нармальнымі наяўныя тэмпы развіцця беларускай мовы. Калі ў 1929/1930 навучальным годзе налічвалася 5526 беларускіх школ, то ў наступным іх колькасць узрасла да 6365. Калі ў 1928 г. тыраж беларускай кніжнай прадукцыі склаў 1838 тыс., то ў 1933 г. – 9379 тыс. экзэмпляраў [22, с. 64-66]. Па-другое, працягвалася паступальнае і

ПолесГУ

дынамічнае развіццё нацыянальных меншасцяў. На задавальнне культурных патрэб 6,8 тыс. літоўцаў (0,14% насельніцтва БССР) працавалі 11 пачатковых (300 вучняў) і 2 сярэднія (197 вучняў) школы, 3 дамы культуры, газета «Чырвоны араты», літоўскі сектар пры Дзяржаўным выдавецтве БССР, літоўская падсекцыя пралетарскай культуры ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР. У 1934 г. у БССР функцыянавала 17 латышскіх школ [23, с. 131].

Дасягненні нацыянальнай палітыкі выкарыстоўваліся для прапаганды сацыялістычных ідэй, а падрыхтаваныя кадры з прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей павінны былі ў выпадку сусветнай рэвалюцыі правесці сацыялістычныя пераўтварэнні на сваіх гістарычных радзімах.

Разам з тым, у нацыянальнай палітыцы адбыліся істотныя змены. Знікла пагроза адміністрацыйных мер уздзеяння ці публічнага асуджэння адказных работнікаў і кіраўнікоў за няведанне і ігнараванне беларускай мовы. Знікла планамернасць і зладжанасць у дзеяннях органаў улады ў ажыццяўленні беларусізацыі. Рэпрэсіўныя мерапрыемствы супраць нацыянал-дэмакратаў прывялі да дэзарыентацыі работнікаў на ніве нацыянальнага будаўніцтва.

Да пачатку 1930-х гг. за кошт рускага народа адсталасць раней прыгнечаных нацый была значна пераадолена. У дырэктывах 17-й партыйнай канферэнцыі УКП(б) (студзень-люты 1932 г.) канстатавалася «зжыванне эканамічнай і культурнай адсталасці нацыянальнасцей, атрыманай у спадчыну ад царскага каланіяльна-капіталістычнага рэжыму» [24, с.332]. У выніку з 1932-1933 г. справа беларусізацыі яшчэ больш прамаруджваецца. Сакавіцкі пленум ЦК КП(б)Б 1933 г. назваў работу Цэнтральнай Нацыянальнай камісіі пры СНК БССР нездавальняючай, а працу мясцовых нацкамісій яшчэ горшай. Беларусізацыя войска абмяжоўвалася строга вызначанымі вайсковымі часцямі. У 1933 г., калі насельніцтва вагалася паміж беларускай і расейскай ідэнтыфікацыяй, улады вырашалі справу ўжо не на карысць беларускай (як гэта было з Церахоўскім раёнам) [25, арк.58].

V Аб’яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б XIV склікання (люты 1933 г.) выступіў супраць беларусізацыі беларускага насельніцтва па-за межамі БССР. У 1933 г. нацыянал-дэмакраты былі абвінавачаны ў ажыццяўленні «гвалтоўнай» беларусізацыі. Снежаньскі аб’яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б) Беларусі (1933 г.) прызнаў, што пастановы лютаўскага і сакавіцкага пленумаў ЦК КП(б)Б (1933 г.) не праводзяцца ў жыццё цэлым радам партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, аднак віну за зрыў беларусізацыі ўсклаў на нацыянал-дэмакратаў, дасягненні якіх прысвоіў сабе.

Дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху Антон Луцкевіч, кіраўнік спраў СНК БССР 1932-37 г. Сымон Кандыбовіч і беларускі вучоны Анатоль Вялікі звярнулі ўвагу на тое, што да 1934 г. улады БССР, у прыватнасці наркамат асветы, патуралі паланізацыі беларускага каталіцкага насельніцтва БССР па наступных прычынах. Польская грамадскасць магла пераканацца ў спрыяльнай для палякаў палітыцы савецкай дзяржавы. Кіраўніцтва БССР спрабавала узмацніць уплыў камуністычнай ідэалогіі ў рэспубліцы, змагацца з уплывам духоўных асоб. Некаторыя ўрадаўцы не разумелі адрознення «польскасці» і «каталіцкасці», кіраваліся этнічнай самаідэнтыфікацыяй грамадзян паводле перапісу 1926 г. (абследаванне 1934 г. паказала, што большасць палякаў не ведала польскай мовы) [26, с.180]. Нават у 1937 г. ідэя федэравання Беларусі з Літвой і Польшчай заставалася папулярнай. Польскі Дзяржынскі раён быў утвораны падчас рэпрэсій у дачыненні да прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху і дыскрэдытацыі беларускай нацыянальнай ідэі. У той час у рэпрэсіўнай палітыцы Савецкай улады ў адносінах да сялянства і нацыянальнай інтэлігенцыі практычна не браўся да ўвагі нацыянальны фактар, а таксама лічылася, што разведка Польшчы кантралявала толькі частку падпольных арганізацыяў.

Утварэнне польскага раёна на мяжы з патэнцыяльным ваенным супернікам не магло адбыцца без санкцыі Крамля. А. Луцкевіч меркаваў аб уплыве непрапарцыянальна вялікага польскага лобі ў савецкім дзяржаўным апараце. У пачатку 1930-х гг. СССР дэманстраваў імкненне развіваць добрасуседскія адносіны з Польшчай. Таму палітычныя дзеячы Заходняй Беларусі падазравалі Расію і Польшчу ва ўзгадненні дзейнасці па асіміляцыі беларусаў. Падобная прапанова была вылучана яшчэ ліберaлам С. Южаковым у «Северном вестнике» (№8 за 1886, с. 25-48). Беларуская эміграцыя абвінавачвала Савецкую ўладу таксама ў імкненні распаліць варожасць у беларуска-польскіх дачыненнях, аслабіць «нацыянальную сілу» беларусаў, іх здольнасць супраціўляцца русіфікацыі.

У пачатку 1930-х гг. польскім раёнам меркавалася абвясціць Плешчаніцкі. Аднак бюро ЦК КП(б)Б выбрала Койданаўскі як раён з больш кампактным размяшчэннем польскага насельніцтва. У 1931 г. ЦК КП(б)Б звярнуўся ў ЦВК БССР па статыстычнае абгрунтаванне пераўтварэння беларускага раёна ў польскі. Работнікам апошняй установы было дадзена заданне павялічыць лік поль-

Полесгу

скага насельніцтва, прыпісаўшы да палякаў беларускіх каталікоў. У выніку бюро ЦК КП(б)Б у лютым 1932 г. звярнулася да ЦК УКП(б) з хадайніцтвам аб тым, каб зрабіць Дзяржынскі раён нацыянальным польскім раёнам.

Практыкавалася выкладанне польскай мовы ў беларускіх школах, дзе вучыліся дзеці каталікоў ці мінімальная колькасць палякаў. Факт навучання неапалячанага беларускага насельніцтва ў польскіх адукацыйных установах ігнараваўся. Пачалося ўкараненне польскай мовы ва ўсе сферы грамадскага жыцця, у прадпрыемствы, установы і г.д. На пратэсты беларускага насельніцтва супраць паланізацыі не было ніякай рэакцыі. Крытыка паланізацыі каталіцкага насельніцтва вызначалася як выступленне супраць лініі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў нацыянальным пытанні.

У пачатку 1933-1934 г. у БССР існавала 289 польскіх школ, у якіх навучалася 17664 чал. Калегія Наркамасветы БССР 28 студзеня 1934 г. вынесла рашэнне павялічыць лік польскіх школ па I канцэнтры да 285, па II – да 60, па III – да 10. У выніку лік польскіх школ павялічыўся на 74 школы (з 289 да 363).

У 1933-1934 г. адбылася дэфармацыя лініі партыі па нацыянальным пытанні, распачаўся асімілятарскі курс ў дачыненні да этнічных супольнасцяў ва ўсіх нацыянальных рэгіёнах Савецкай краіны, падобны на нацыянальна-культурныя мерапрыемствы царскага ўрада.

Па-першае, партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва свядома ўзяло курс на павышэнне сферы ўжытку рускай мовы. Прыкладна з 1933-1935 гг. рускія перасталі разглядацца як нацыянальная меншасць. Інтарэсы гэтай дзяржаваўтваральнай нацыі былі пастаўлены пад ахову партыйна-дзяржаўных органаў. Па-другое, быў спынены працэс беларусізацыі, прычым у тым часе, калі павялічвалася доля карэннага насельніцтва сярод гараджан. Прыкладам, у 1926 г. толькі 32% работнікаў прамысловасці Віцебшчыны былі беларусамі. Праз дзесяць год доля беларусаў дасягнула паказчыку 62% [27, с.69, 196; 28, с.189]. Па-трэцяе, пытанне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Еўропе страціла актуальнасць, таму адпала неабходнасць здавальнення нацыянальна-культурных запатрабаванняў нацыянальных меншасцяў, падрыхтоўкі нацыянальных кадраў. Нятытульныя супольнасці, асабліва калі іх гістарычныя радзімы мелі агульную граніцу з СССР, аўтаматычна пераўтвараліся ў «пятую калону» і сацыяльную базу «контррэвалюцыйных» настрояў.

Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў праводзілася за два этапы. Для першага этапа (1934-1936 гг.) характэрна:

1) Ігнараванне праблем развіцця нацыянальных меншасцяў, аналіз стану развіцця апошніх абмяжоўваецца выняткова канстатацыяй дасягненага росквіту і пастаноўкай праблем, якія належыць развязаць.

2) Вызначэнне паланізацыі Койданаўшчыны, беларускіх нацыянальных саветаў і школ як выпраўленай палітычнай памылкі.

3) Паступовае, але няўхільнае змяншэнне колькасці надрукаваных кніг, газет і часопісаў на мовах нацыянальных меншасцяў, закрыццё адукацыйных і культурна-асветных ўстаноў, ліквідацыя нацыянальных саветаў. Так, калі ў 1936 г. тыраж кніг на яўрэйскай мове склаў 124 тыс. экзэмпляраў, то ў наступным годзе ён зменшыўся да 46 тыс. [29, с. 46; 30, с. 64].

Фармальнай зачэпкай дэпаланізацыі быў той факт, што пры правядзенні пашпартызацыі насельніцтва Дзяржынскага раёна колькасць палякаў апынулася непараўнальна меншай у параўнанні з дадзенымі, атрыманымі пры арганізацыі польскага раёна. ЦК УКП(б) указаў беларускаму парткіраўніцтву 24 ліпеня 1934 г. на «няправільную палітыку і практыку насаджэння ў раёнах і сёлах з бальшынёй беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовага навучання дзяцей на польскай мове» [31, с.115], загадаў «перагледзець сетку і нацыянальны характар школ у духу найбольшага забеспячэння інтарэсаў беларускае мовы». Рэспубліканская кіраўнічая эліта спрабавала адхрысціцца ад гэтага «шкодніцтва», перакладаючы адказнасць на польскую разведку, капіталістычныя элементы вёскі, на нацдэмаў, абараняючы палітычную падаплёку паланізацыі.

У 1937-1939 гг. праводзіўся другі этап асіміляцыі этнічных супольнасцяў. Былі ліквідаваны нацыянальныя саветы. Згортваўся друк на нацыянальных мовах. Вучні нацыянальных навучальных устаноў былі пераведзены на рускую ці беларускую мову навучання з 1 верасня 1938 г. Пад ціскам кіраўнікоў камісіі па праверцы рэспубліканскай партыйнай арганізацыі Г. Малянкова і Я. Якаўлева 28 ліпеня 1937 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову «Аб ліквідацыі палітыкі паланізацыі, якая праводзілася нацыянал-фашыстамі», у выніку чаго была рэпрэсавана вялікая частка партыйна-савецкага кіраўніцтва. XVII з'езд КП(б)Б пацвердзіў, што польскія школы, раён, калгасы і саўгасы былі цэнтрам работы польскай разведкі. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў значна пацярпелі ў выніку ажыццяўлення шэрагу аперацый НКУС СССР па ліквідацыі замежнай агентуры ў БССР. Палякі не проста складалі сярод рэпрэсаваных працэнт, большы за іх долю ў насель-



ПолесГУ

ніцтве. Прадстаўнікоў рэспублікі ахапіла паланафобія. Напрыклад, удзельнік пленума ЦК КП(б)Б ад 17-19 жніўня 1937 г. Волкаў, адзначыўшы неабходнасць ліквідацыі польскіх школ у БССР, прыгразіў усім палякам БССР: «Ничего, пускай живут, работают, а вредить будут – возьмём на дачу» [32, с.173].

**Заключэнне.** Як бачна, вынікі нацыянальна-культурнага развіцця БССР у 1930-я гг. даволі супярэчлівыя.

1) Дэфармацыя нацыянальнай палітыкі ў адносінах да этнічных супольнасцей паставіла пад пагрозу іх існаванне на Беларусі, заклала аснову палітычнай нестабільнасці.

2) З сярэдзіны 1930-х гг. у БССР пачалі паралельна ўжывацца дзве мовы – руская і беларуская. Прычым у вышэйшых сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця запанавала менавіта руская мова. Руская мова дамінавала ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, беларуская – у сярэдняй адукацыі, руская мова абслугоўвала кіраўнічую эліту – мясцовыя чыноўнікі не грэбавалі беларускай, гарадское насельніцтва гаварыла пераважна па-руску, сельскае – па-беларуску. Калі ў канстытуцыі рэспублікі 1937 г. адзначалася, што законы Вярхоўнага Савета БССР публікуюцца на чатырох мовах, то ў рэдакцыі 1938 г. – толькі на беларускай і рускай. Падобныя змены кранулі і надпісаў на дзяржаўным гербе БССР. Да канца 1930-х гг. беларуская мова абмежавана ўжывалася ў публічных выступах і мясцовым справаводстве, у навуковых, культурных, адукацыйных і асветных установах і асяродках. Беларуская этнічная, моўная і культурная спецыфіка, мэтазгоднасць існавання БССР не ставіліся пад сумнеў.

3) Калі двухмоўе (білінгвізм) не рэгулюецца заканадаўствам, то мае тэндэнцыю абмяжоўвацца да аднамоўя (моналінгвізму). Паколькі патрэба значнай часткі насельніцтва краіны ў нацыянальных мовах зменшылася, то беларусы зноў пачалі атаесамляць мову з уладай: сімптаматычна, напрыклад, што большасць твораў Сталіна, выданых у БССР у 1933-1936 гг., была на расейскай мове, а не на беларускай, у адрозненне ад Маркса, Энгельса і Леніна. Адзначым, што ўпершыню двухмоўе пачалі прапагандаваць славянафільскі часопіс «День», а таксама арганізацыі, якія стаялі на платформе заходнерусізму («Союз Белорусской демократии», «Белорусское общество»).

## ЛІТАРАТУРА


1. Каляда, І.У. Палітыка беларусізацыі: прычыны яе згортвання / І.У. Каляда // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. – 1998. – № 1. – С. 75-80.

2. Пурышева, Н.М. Деятельность «Комиссии Затонского» и пути развития белорусской художественной культуры / Н.М. Пурышева // Куляшоўскія чытанні / пад рэд. В.М. Мартынавай [і інш.] – Магілёў : МДУ, 2008. – С.30 – 31.

3. Пурышева, Н.М. Левый поворот : октябрьский (1930 г.) пленум ЦК КП(б)Б и белорусская культура// Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі : у 4 ч. Ч. 3 / Пад рэд. І. П.Крэня, У.І. Навіцкага, І.А. Змітровіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С.161 – 165.

4. Платонаў, Р.П. Лёсы : гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20-30-х гадоў / Р.П. Платонаў. – Мінск : БелНДІДАС, 1998 – 326 с.

5. Платонаў, Р.П. Палітыкі. Ідэі. Лёсы. (Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолагапалітычнага дыктату ў Беларусі 20-х – 30-х) / Р.П. Платонаў. – Мінск : БелНДІДАС, 1996. – 328 с.

6. Бандарэнка, М.А. Беларусізацыя ў вайсковых часцях у 1920-1930-я гг / М.А. Бандарэнка // Беларускі гістарычны часопіс, 2003. – №4. – С.11 – 16.

7. Тугай, У.В. Латышы на Беларусі / У.В. Тугай ; [Прадм. В.М. Фаміна]. – Мінск : Скакун, 1999. – 133, с.

8. Этнічныя супольнасці ў Беларусі : гісторыя і сучаснасць : навук. канф. (Мінск, 6-7 снеж. 2001 г.) / Навук. рэд.: У.Навіцкі, М.Сташкевіч. – Мінск : Дэполіс, 2001. – 387 с.

9. Этнонациональные и конфессиональные процессы в транформирующемся обществе / редкол.: У.Д. Розенфельд (отв. ред.) [и др.]. Ч.І. – Гродно : ГрГУ, 2001. – 326 с.

10. Нацыянальныя меншасці Беларусі : матэрыялы 1-й Нац. навук.-практ. канф., 21-22 мая 1996 г. Кн. 2 : Нацыянальныя меншасці і міжэтнічныя зносіны на Беларусі ў святле гістарычных фактаў / Навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст-Мінск-Віцебск : Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, 1996. – с. 65-67.

11. Лейзеров, А. Национальная политика в Беларуси в первые годы советской власти (1920-1939) / А. Лейзеров // Беларусь у XX стагоддзі : зб. навук. прац. / Навук. рэд. В.П.Андреев. – Мінск – Томск : Водолей, 2002. – С. 88 – 95.

12. Лейзеров, А. Участие поляков в государственной, экономической, культурной жизни Беларуси (1920-30-е годы) /А. Лейзеров // Нацыянальныя пытанні: матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21-25 мая, 4-7 снеж. 2000 г.) / Рэдкал.: Э. Дубянецкі (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – С.193 – 201.




Полесгу

13. Пурышева, Н.М. Взаимовлияния белорусской и польской культур в 20-30 годы XX века / Н.М. Пурышева // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў / Адказныя рэдактары : У. Міхнюк, П. Ганцарэк, Мінск: БДУ, 2001. – С. 206 – 218.
14. Дзядзінкін, А.Л. Рэпрэсіі другой паловы 1920-1930-х гадоў як адзін са сродкаў ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі савецкай улады на Беларусі / А.Л. Дзядзінкін // Веснік МДУ імя А.А.Куляшова, 2003. – №4(16). – С. 34 – 35.
15. Акуневіч, В.У. Рэпрэсіі ў адносінах да нетытульных этнічных супольнасцей Беларусі як элемент нацыянальнай палітыкі савецкай улады (на прыкладзе Віцебшчыны канца 1920 – 1930-х гг.) / В.У. Акуневіч, А.Л. Дзядзінкін // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспуб. навук. канф.: у 4 ч. Ч. 3 / Пад рэд. І.П. Крэня, У.І. Навіцкага, І.А. Змітровіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С.142 – 145.
16. Таболаў, К. Нацыянальнае пытаньне на XVI зьезьдзе УсеКП(б)Б з дадаткам перадавога артыкулу «Праўды"» / К.Таболаў. – Менск : БДВ, 1930. – 42 с.
17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 14906.
18. Лобан, І. Беларуская народная песня / І. Лобан // Звязда. – 1935. – 8 красавіка.
19. Улашчык, М. Выбранае / М.Улашчык. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. –384 с.
20. Навіцкі, У. Гістарыяграфія гісторыі культуры Беларусі 20 ст.: вынікі і перспектывы даследаванняў /У. Навіцкі // Гістарычны альманах. – 2002. – № 7. – С. 48 – 54.
21. Лыч, Л. Дзве іпастасі «Звязды»: выкрывальніца нацдэмакратызму і заступніца беларусізацыі /Л. Лыч // Звязда. – 2009. – 7 лютага.
22. Печать СССР в 1928, 1933 и 1934 гг. Москва : Крестьянская газета, 1936. – 96 с.
23. Skilters, K. Latviju zemneeks baltkreevijā pirms un pec Octobra revolucijas=Латышскі селянін на Беларусі да і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі / K. Skilters. – Minska : Baltakreevijas Zinatnu Akademijas izdevneeciba, 1935. – 144 с.
24. Протько, Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941 гг.) / Т.С.Протько. – Минск : Тесей, 2002. – 688 с.
25. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. –Справа 6343.
26. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 10917.
27. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 7096.
28. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 9109.
29. Печать СССР в 1936 году. Статистические материалы. – Москва : Изд-во Государственной книжной палаты, 1937. – 116 с.
30. Печать СССР в 1937 году. Статистические материалы. – Москва : Изд-во Государственной книжной палаты, 1938. – 94 с.
31. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 10917.
32. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Справа 10959.

## ABOUT THE NATIONAL POLICY OF THE PARTY AND STATE GOVERNMENT IN THE BELARUSIAN SSR IN 1930-S

***M.K. ALHOVIK***

***Summary***

In this article, the author tries to present the hole picture of the Soviet national policy in the Byelorussian SSR in 1930-s. Special attention is paid to the polonization of the Belarusian Catholics in the first half of 1930-s and at the analysis of the language situation in BSSR in the second half of 1930-s.

© Альховик М.К.

*Поступила в редакцию 6 апреля 2011 г.*

Полесгу